Незалежнае выданьне Жодзіна й Смалявіцкага раёну


Жодзіна, студзень 2007


Прэс анарама #8

Інфармацыйны агляд рэгіянальных і агульнанацыянальных падзеяў




Навіны, факты, камэнтары, карысныя парады: эканоміка, грамадзтва, правы, зьмены заканадаўства, калектыўная абарона грамдзкіх інтарэсаў, правоў і свабодаў ...





ГІМНАЗЫЯ №1 У ЖОДЗІНЕ



ДАНІЛКА ЎРБАНОВІЧ — ПЕРАМОЖЦА Ў НАМІНАЦЫІ ЛЕПШЫ НАВАГОДНІ СТРОЙ





БЕЛАРУСКАЯ ЕЛКА ЗНОЎ У ЖОДЗІНЕ ...



Ï ðýñ Ï À Í ÀÐÀ Ì À



Цэнтар Ліцьвіны

E-mail: c_licviny@tut.by,
Сайт: www.licviny.INFO

ÍÀØÀ ÅËÊÀ...

ØÊÎËÀ

СЬВЯТА ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ БЕЛАРУСАЎ У ЖОДЗІНЕ АДБЫЛОСЯ, АЛЕ ЗЬЯВІЛІСЯ ПЫТАНЬНІ ...





30.12.2007г.
Жодзіна

29.12.2007г. а 12-30 у Жодзінскай Гімназыі №1 прайшло сьвяткаваньне Раства й Новага году, зарганізаванае з ініцыятывы й пры актыўным удзеле беларускамоўных бацькоў і дзяцей з бацькоўска-дзіцячага Клюбу “Нашыя дзеці й Мы”, ТБМ, сябраў БНФ “Адраджэньне” і простых грамадзянаў, бацькоў Янкі Лапіцкага, што адзін у Жодзіне працягвае адукацыю ў клясе зь беларускамоўнай праграмай навучаньня.

Янка і ягоныя бацькі ўжо ня першы год запрашаюць сяброў на



Сьвятлана Лапіцкая віншуе Янку Жураўскага з Новым Годам



сьвяткаваньне Раства і Новага Году па-беларуску. І кожны год на Беларускую Елку зьбіраюцца дзеці й бацькі з Жодзіна, Смалявічаў і, нават, зь Менску. І кожны раз, ня гледзячы на абставіны, у якіх даводзіцца адстойваць права на беларускамоўнае сьвяткаваньне Раства Хрыстова і Навагодняй Елкі, дзякуючы духоўнаму паяднаньню, якое заўсёды прысутнічае паміж людзьмі добрае волі, сьвята адбываецца цудоўным і запамінальным. Дзецям нельга схлусіць – яны адчуваюць штучнасьць адразу. Толькі сапраўдная любоў да Айчыны, да роднай мовы, да спрадвечных хрысьціянскіх каштоўнасьцяў … могуць абудзіць пачуцьці, натхніць на лепшае, узрадваць і ўвазвысіць … Ці не да гэтага імкнецца сучасная пэдагагічная навука і практыка? Шчырая любоў, праўдзівасьць і ўласны прыклад – найлепшыя пэдагогі і выхаваўцы. А сапраўдным падарункам заўсёды зьяўляецца сардэчнае цяпло, якім абменьваюцца сябры ўчасе сьвяткаваньня найсьвятлейшага сьвята ў годзе – Божага НАРАДЖЭНЬНЯ ў чаканьні надыходу Новага Году.

Гэтак і сёлета, настрой удзельнікаў, асабліва дзяцей, ня здолелі

Фота: Аляксея Лапіцкага, Licviny-INFA



сапсаваць ні кантакты з адміністрацыяй школы, ні “сюрпрызы”, якія падрыхтавала ў гэтым годзе ўдзельнікам школьная адміністрацыя … Аказалася, што ранішнік “Беларуская Елка”, заплянаваны ў працоўную суботу 29-га а 12-30, пры гэтым з боку школы, на гэты раз, весьці мерапрыемства даручылі настаўніцы беларускай мовы. Пры гэтым ёй, нават, не далі



мікрафону (!?) Акрамя таго, відавочна, пад наглядам галоўнага “сцэнарысту”, які пажадаў застацца “за кадрам”, пасьля абвяшчэньня “Дзедам Марозам” заканчэньня Елкі, ніхто не паведаміў пра працяг ранішніка ў фармаце дыскатэкі. Бацькам прыйшлося самастойна тлумачыць асобным групам дзяцей, якія скіраваліся на выхад, што Елка Працягваецца й далей будзе танцавальная праграма, пачастункі, конкурсы й сьпевы. Пры гэтым, невядомая асоба, альбо з Адзьдзелу Адукацыі альбо зь адзьдзелу па ідэалёгіі, якая апынулася ў гэты час ля праходу ў залю … — выправаджвала вяртаючыхся дзяцей абратна ў калідор

Стваралася ўражаньне, што “нехта” ў Гімназыі №1 вырашыў негалосна “сарваць” беларускамоўнае









мерапрыемства, альбо зрабіць яго максымальна непрывабным і незапамінальным для дзяцей … У залі часта выключалася сьвятло тады, калі яно было патрэбным, вядучым не даваліся мікрафоны, тады, калі гэта было відавочна неабходным, а певедамленьні рабіліся няўпэўнена ці двухсэнсоўна, не было кульмінацыйнага нарастаньня інтрыгі й адпаведнага кіраваньня падзеямі ў залі … , а прапанаваныя беларускамоўнымі ўдзельнікамі кампазыцыі для дыскатэкі, былі адкладзены ў бок і так і не прагучалі …

У выніку, замест кульмінацыйнага заклiку і пачатку дыскатэкі з выкідваньнем у залю мноства разнакаляровых паветраных балёнікаў (што ў мінулым адзначалася "школьным сцэнарыстам" як выдатная знаходка для будучых мерапрыемстваў) ажыўлённая заля атрымала абвестку аб заканчэньні мерапрыемства з вуснаў самаго "Дзеда Марозу". Гэта прагучала прыкладна так: "Вось і ўсё. На гэтым нам прыйдзецца разьвітацца. Дзякуй усім за удзел у Елке … дапабачэньня".

При гэтым, "Дзед Мароз" нікуды не сыходзіў, як бы запрашая дзяцей і бацькоў самім пакінуць памяшканьне … Шмат, хто зразумеў гэткую абвестку менавіта такім чынам, што мерапрыемства скончылася й далей нічога не чакаецца … Нейкая неразборлівая арганізацыйная абвестка пра далейшы працяг мерапрыемства, выказаная неадразу і без належнага гукаўзмацненьня была ўспрынята не адразу ...

І ўсё ж, ня гледзячы на гэты відавочны "канфуз" і назіраемую, на гэты раз, дэструктыўную тэндэнцыю … — бацькі й дзеці засталіся вельмі задаволенымі тым, што атрымалася ў выніку. Напрыканцы, дзяўчаты не жадалі разыходзіцца — жадалі працягу танцавальнае праграмы … , а ўжо ў памяшканьні "Янкінай клясы" дзеці працягвалі хорам дэклямаваць беларускія вершы, спаборнічаць у веданьні беларускіх вершаў і сьпеваў, атрымліваць сьвяточныя падарункі й сувэніры.

Данілка Урбановіч стаў абсалютным пераможцам у намінацыі "створаны ўласнаруч навагодні строй". Ён быў Джэкам-Верабьём, змагаром і абаронцам Бацькаўшчыны, расказваў вершы на роднай мове: адмыслова складзены з бацькамі пра свой вобраз, а таксама пра Радзіму Беларусь.

Ян Жураўскі, таксама адзначыўся эрудыцыяй і атрымаў столькі пачастункаў і сувэнікаў, што разам з сьвяточнымі падарункамі несьці іх да дому яму дапамагаў старэйшы брат Алесь.





Глядзець на беларускамоўных хлапчукоў, было надзвычай прыемна й радасна, радасна за іх саміх, за іхных бацькоў, якія ўкладаюць у сваіх дзяцей душу й выхоўваюць іх сапраўднымі Беларусамі, свабоднымі, шчыра ўлюбёнымі ў сваю Радзіму, у Беларусь. Задаволенымі засталіся й сябры з Смалявічаў, Сьцёпа і Артур, што ўпершыню прыехалі да Янкі на Беларускую Елку ў Жодзіна …







Такім чынам, ня гледзячы на асобныя пытаньні да арганізатараў, беларускае сьвята для беларускіх дзяцей і бацькоў у Жодзіне — атрымалася. Выказваем падзяку за гэта усім, хто яго ў чарговы раз

ÆÎÄÇ²ÍÀ

ÍÀØÀ ØÊÎËÀ!





Янка запрашае сяброў!

ініцыяваў, дабіўся й зьдзейсьніў …, зрабіў сапраўднай Падзеяй-2007 для Жодзінскіх беларускамоўных дзяцей і бацькоў.

А з крытычных момантаў дарослыя, верагодна, зробяць адпаведныя высновы й прыкладуць намаганьні для іх выпраўленьня ў будучым.

А пакуль, ЗА ЎСЁ БЕЛАРУСКАЕ ПРЫХОДЗІЦЦА ЗМАГАЦЦА сапраўды НА КОЖНЫМ КРОКУ …

Прыходзіцца задавацца і пытаньнямі кшталту:
“ЦІ Ж БЕЛАРУСКАЯ ГЭТА ДЗЯРЖАВА?
ЦІ БЕЛАРУСКАЯ ЎЛАДА?
ЦІ БЕЛАРУСКАЯ ШКОЛА? …”

Пытаньні сувэрэнітэту й незалежнасьці ня могуць разглядацца ў адрыве ад пытаньняў мовы, выхаваньня й адукацыі …

Ня можа быць незалежнай дзяржава без належных адносінаў да ўласнай гісторыі, роднай мовы, да дзяцей, падлеткаў, моладзі … да нацыянальных здабыткаў, годнасьці і самапавагі …

Але без павагі да продкаў і гісторыі ўласнай краіны не бывае самапавагі ў нацыі!



Без самапавагі – няма гарантыяў таго, што заўтра не прыйдзе новы гаспадар-чужынец і не прымусіць паважаць ужо ягоныя велікадзяржаўныя каштоўнасьці …, зноў не паставіць патрыётаў “да сьценкі”, а народ – на калені…


Беларускім дзецям, якія гадуюцца ў любові да Бацькаўшчыны й растуць сапраўднымі патрыётамі Беларусі павінна быць гарантаваная лепшая будучыня – гарантаваная дзяржаваю, Беларусьсю!.

Моцнай і заможнай краіну робяць свабодныя ад прыгнёту і страху людзі – таленавіты і аб’яднаны ў нацыю народ. Калі Беларусь здолее прайсьці шляхам адраджэньня, ад аднаўленьня гістарычнае памяці й традыцыяў, шанаваньня й карыстаньня роднай моваю … да пазбаўленьня ад жывёльнага страху й прыніжанасьці, да чалавечае годнасьці й самапавагі, веры ў сябе, уласную краіну і будучыню – тады й паявіцца беларуская нацыя.

Толькі тады, можна будзе казаць пра моц і стабільнасьць, пра квітнеючую і заможную пэрспэктыву ў вольнай і незалежнай Беларусі.

Падобныя пытаньні ці разважаньні пасьля звычайнай пераднавагодняй Елкі ў Жодзіне — незвычайная зьява (для нармальнай сытуацыі і ў нармальнай краіне).

Можна толькі зрабіць адну сумную выснову — не ўсё так правільна й гладка ў асобна ўзятым “каралеўстве” … Але казкі пра “караля-абаронцу”, альбо “генэралісымуса з царскімі паўнамоцтвамі” тут, нажаль, шмат каму яшчэ падаюцца рэальнасьцю …





Алесь Вольны, Жодзіна, Licviny-INFA



Незалежнае выданьне Жодзінскіх ініцыятываў “ЗА ЭЎРАПЕЙСКІ ГОРАД” і Цэнтру «Ліцьвіны»

Адрас рэдакцыі:
222160 Жодзіна, а/с 201.
E-mail: c_licviny@tut.by

Наклад 299 асобнікаў.
Рэдактар АЛЕСЬ ВОЛЬНЫ
Пры передруку спасылка на выданьне і першакрыніцу абавязковая.

